глыбока разумець іх стылістычныя якасці. Для гэтага можна прапанаваць наступныя заданні: падабраць да слоў аднакаранёвыя, скласці словазлучэнні, складаныя сказы. Пры парушэнні нормаў словаўжывання неабходна зрабіць аналіз некаторых яго выпадкаў.

Напрыклад:

*Больш за ... ці больш як ...?* Якое з гэтых спалучэнняў лічыць правільным? Якое з іх неабходна і можна ўжываць? Слова *больш* з'яўляецца вышэйшай ступенню ад прыслоўя *многа*. Прыслоўе *больш* у спалучэнні з колькаснымі назоўнікамі або з колькаснымі назоўнікавымі злучэннямі ўказвае на перавышэнне абазначанай колькасці і ўжываецца з прыназоўнікам *за* і дапаўненнем у вінавальным склоне. Напрыклад: больш за гадзіну, больш за год, больш за тыдзень.

З прыназоўнікам *за* і дапаўненнем вінавальнага склону ўжываюцца і прыметнікі вышэйшай ступені, тыпу *больш за яго, меншы за яго, смялейшы за ўсіх*. Спалучэнне *больш як...* уласціва гутарковай мове і не з'яўляецца нормай.

Усё вышэйпададзенае пераконвае ў тым, што разнастайныя віды працы з краязнаўчым тэкстам дапамагаюць студэнтам павысіць узровень моўнай культуры і авалодаць усімі ўнармаванымі сродкамі беларускай літаратурнай мовы.

*Т.М. Капусціч*
Мінск (Беларусь)

## ВЕРБАЛЬНЫЯ І НЕВЕРБАЛЬНЫЯ СРОДКІ Ў СЛУЖБОВЫМ МАЎЛЕННІ

Сучасныя нормы выкладання нацыянальнай мовы ў ВНУ патрабуюць, каб выкладчык не толькі перадаваў студэнтам арфаграфічныя, арфаэпічныя, акцэнталагічныя, лексічныя, стылістычныя і іншыя нормы правільнасці, але і навучаў выкарыстоўваць маўленне ў разнастайных сферах грамадскага жыцця.

Кожны студэнт сёння — гэта спецыяліст заўтра, таму выкладчыкі-філолагі павінны ўдзяляць асаблівую ўвагу моўнай падрыхтаванасці будучых прафесіяналаў. Высокакваліфікаваны спецыяліст абавязаны валодаць не толькі спецыяльнымі ведамі, але і быць моўна выхаваны, таму што культура мовы спецыяліста — састаўная частка яго прафесійнага іміджу. Дзелавыя або службовыя зносіны падразумяваюць не толькі абмен інфармацыяй, але і выпрацоўку рашэнняў, прынящце абавязацельстваў, заключэнне кантрактаў, а гэта значыць выкарыстоўваецца пісьмовая і вусная мова, замацоўваюцца вербальныя і невербальныя элементы. Вуснае маўленне больш спрошчанае па сваім слоўніку, граматычных формах, мае сціслыя сінтаксічныя канструкцыі, нават дапускае паўторы, а пісьмовае насычана аб'ёмнымі сказамі, тэрміналагічнай лексікай, устойлівымі адзінкамі. Студэнт-нефілолаг павінен авалодваць та-

кімі неабходнымі дзелавымі якасцямі, як уменне весці размову, падтрымліваць дзелавую гутарку, прымаць і фармуляваць рашэнні. Будучы спецыяліст, а тым больш кіраўнік, абавязаны авалодаць сілай слова, якое існуе як асноўны інструмент уздзеяння на аўдыторыю.

Зносіны людзей пры сустрэчы пачынаюцца з прывітання, якое трэба лічыць абавязковай этыкетнай формай для ўсіх знаёмых. Нават асабіста незнаёмыя супрацоўнікі адной установы, арганізацыі або фірмы вітаюць адзін аднаго, а ў сельскай мясцовасці на Беларусі прынята пры сустрэчы вітаць жыхароў сваёй вёскі. Распаўсюджанае сярод моладзі або добра знаёмых "Прывітанне!" не дапускаецца ў афіцыйных зносінах або ў прывітанні малодшым старэйшага. Маўленчы этыкет строга патрабуе першым вітаць старэйшага па ўзросту, мужчыне — жанчыну, падначаленаму — начальніка, але больш ветлівым павінен быць начальнік, а не падначалены. Ва ўстанаўленні кантакту паміж супрацоўнікамі ў калектыве важнае месца адводзіцца ветліваму звароту, бо непрымальны ці непрыемны зварот можа стаць адзінай перашкодай у развіцці ўзаемасувязей, а цёплае прывітанне можа пакласці пачатак не толькі карысным дзелавым, але і сяброўскім адносінам. А сітуацыя развітання — выніковая стадыя моўнага кантакту, але яе можна разглядаць як вынік папярэдніх зносін, як планаванне будучага супрацоўніцтва і жаданага партнёрства. Якасць службовых узаемаадносін залежыць ад мовы спецыялістаў: ясны выклад сваіх думак, правільнасць маўлення, выразная дыкцыя робяць гутарку або выступленне даступным, садзейнічаюць пошуку аптымальных рашэнняў. Эмацыянальны бок зносін узмацняюць такія невербальныя або дадатковыя ў мове сродкі, як выразная міміка і жэсты. Міміка ўласціва кожнаму з нас, можа быць болей ці меней выражанай, але заўсёды непаўторнай і асабістай. Рысы прамоўцы, яго ўласная жэстыкуляцыя, выразныя рухі мышцаў твару (міміка), позірк дапаўняюць мову, яна ўспрымаецца ў цэласным кантэксце. Даныя ўласцівасці ўзмацняюць эмацыянальны бок прафесійнай размовы або выступлення, але прымяняць іх неабходна ўмела. Не патрабуецца суправаджаць жэстыкуляцыяй увесь тэкст выступлення, прамовы, таму што не кожная фраза патрабуе падкрэслівання жэстам. Колькасць і інтэнсіўнасць жэстаў павінны адпавядаць умовам і мэтам зносін, паколькі для беларусаў уласціва ўмераная жэстыкуляцыя. Прынята лічыць: калі выступаючаму няма чаго сказаць па сутнасці, то ён пачынае актыўна жэстыкуляваць. Такія паводзіны адцягваюць увагу субяседнікаў або слухачоў, таму варта памятаць, што пры актыўным уключэнні невербальных элементаў у моўную плынь збядняецца яе выразнасць, зніжаецца эфектыўнасць уздзеяння на прысутных.

Мікрафон выкарыстоўваецца толькі ў крайнім выпадку: ён скажае нашу асабістую мову і ўскладняе наладжванне кантакту з людзьмі. Любы дыялог будзе больш даверлівым і цёплым, калі адлегласць паміж камунікантамі меншая. Залатое правіла маўленчых зносін сцвярджае: чым цішэй гаворыш, тым лепш цябе зразумеюць. Ціхая, прыемная, спакойная мова афарбавана і тэмбрам голасу, і абаяльнасцю прамоўцы, але і

ў ёй можа прысутнічаць патрабавальнасць, рашучасць, выразнасць. Ціхая прамова настройвае на развагу, а гучная выклікае трывогу, неспакой. Прыкметай культуры і розуму лічыцца мілагучная, выразная, чыстая і багатая мова. Выступленне не заўсёды пачынаецца з уступу, хоць ён і пажаданы. У апошні час практыкуецца неардынарнасць ва ўступнай частцы, каб адразу быць заўважаным і пачутым. Першымі фразамі могуць быць як камплімент аўдыторыі, так і цікавы факт, нават вясёлая гісторыя. Пачаць таксама можна і з самага галоўнага, з таго, дзеля чаго сабраны супрацоўнікі, што яны жадаюць пачуць. Заканчваецца выступленне абавязкова падвядзеннем выніку, падагульненнем, прапановамі. Выступаючы не павінен забыць і аб тым, што неабходна падзякаваць аўдыторыі за ўвагу, за магчымасць выказацца.

Тэмп нашай мовы своеасабліва зрастаецца са зместам, таму больш значныя часткі матэрыялу будзе лепей выкласці павольней, выдзеліць інтанацыйна. Лічыцца, што чым большая колькасць слухачоў, тым павольней трэба гаварыць. Выступаючаму неабходны паўзы: па-першае, на іх звяртаецца ўвага, па-другое, яны дазваляюць сэнсава аддзяліць часткі тэксту, па-трэцяе, вытрымаць патрэбную паўзу — майстэрства аратара. Выбар моўнага матэрыялу залежыць ад сацыяльнага, дэмаграфічнага складу аўдыторыі, яе эмацыянальнага настрою, сітуацыі (дзелавая нарада, выступленне перад невялікай групай падначаленых, супрацоўнікаў ці інш.). Калі сярод прысутных ёсць людзі розных спецыяльнасцей, спецыялізацый, то тэрміны, якія могуць быць незразумелымі для часткі слухачоў, абавязкова тлумачацца.

Цікавасць — самая асноўная ўмова поспеху любой прамовы. Найперш самому важна цікавіцца тым, што даносіце да слухачоў ці чытачоў. Упэўненым можна быць толькі тады, калі выдатна ведаеш прадмет выступлення, а некампетэнтнаму, няўпэўненаму ў верагоднасці і праўдзівасці прапануемага матэрыялу цяжка ўпэўніць іншых. Безумоўна, кантакт ускладняецца чытаннем папярэдне падрыхтаванага тэксту, апраўдана толькі зачытванне асобных фактаў, момантаў, лічбаў.

Важнейшыя патрабаванні да дзелавой мовы — канкрэтнасць і канструктыўнасць. І кіраўнік, і падначалены пры вырашэнні прафесійных праблем павінны ўмець пазбягаць расплывістых, агульных моўных адзінак, моўных трафарэтаў і канцылярскіх выразаў, імкнуцца да разнастайнасці маўлення. Жывыя службовыя зносіны грунтуюцца на вуснай непасрэднай мове, а калі неабходны кантакт з людзьмі, якія не могуць быць суразмоўцамі, то выкарыстоўваюць пісьмовую мову: службовыя лісты, факсы і інш. Вусная мова заўсёды нясе ў сабе жывы патэнцыял асобы, сілу яго ведаў, веры, упэўненасці. Менавіта такой мове ўласцівыя тэмп, інтанацыя, выразнасць, акцэнты. Поспех, выніковасць, вартасць прафесійнага маўлення залежаць ад мноства фактараў, але ні жэсты, ні інтанацыя, ні знешні выгляд асобы не заменяць сілы слова. Толькі свабодна валодаючы вербальнымі сродкамі, маючы дастатковы лексічны запас, магчыма поўнасцю авалодаць увагай слухачоў, данесці неабходнае, пераканаць, зацікавіць.